

# Вернасць альма-матэр, выпрабаваная часам і справай

У ліпені адзначыў свой юбілей – 60 год – рэктар Беларускага нацыянальнага тэхнічнага універсітэта, доктар тэхнічных навук, прафесар, член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь, член рэдакцыйнай калегіі «ВШ» **БАРЫС МІХАЙЛАВІЧ ХРУСТАЛЁЎ.**

Барыс Міхайлавіч нарадзіўся 21 ліпеня 1947 года ў Гомелі. У 1970 годзе скончыў Беларускі палітэхнічны інстытут па спецыяльнасці «Цеплазабеспячэнне і вентыляцыя». Пэўны час працаваў інжынерам-наладчыкам, сакратаром камітэта камсамола спецтрэста «Белпрамналадка». Але большая частка яго жыцця звязана з родным «палітэхам». У 1985 годзе паступіў ў аспірантуру БПІ, пасля заканчэння якой паслядоўна – асістэнт, дацэнт кафедры цеплагазазабеспячэння і вентыляцыі, выконваючы абавязкі загадчыка гэтай кафедры, затым – загадчык кафедры атаплення і вентыляцыі, намеснік дэкана будаўніча-тэхналагічнага факультэта, прарэктар, першы прарэктар. Пасля невялікага перапынку (у 1997–2000 гадах працаваў першым намеснікам Міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь) зноў вярнуўся ў альма-матэр, ужо ў якасці рэктара.

Барыс Міхайлавіч ўнёс значны тэарэтычны і практычны ўклад у развіццё вышэйшай тэхнічнай адукацыі на Беларусі, з'яуляецца адным з ініцыятараў станаўлення яе шматузроўневай сістэмы. Асабіста садзейнічаў развіццю вядомых навукова-педагагічных школ, з'яўляецца навуковым кіраўніком Дзяржаўнай праграмы фундаментальных даследаванняў «Будаўніцтва і архітэктура», падрыхтаваў трох кандыдатаў навук, апублікаваў 157 навуковых артыкулаў, 14 падручнікаў і вучэбна-метадычных дапаможнікаў, 3 манаграфіі, аўтар 10 вынаходак.

Пад кіраўніцтвам Б.М. Хрусталёва распрацавана сацыяльная праграма па падрыхтоўцы сельскай моладзі да паступлення ў вышэйшыя навучальныя ўстановы краіны; у 23 раёнах Беларусі створаны ліцэйскія класы, з вучнямі якіх рэгулярна працуюць выкладчыкі БНТУ.

Рэктар асабіста каардынуе пытанні ідэалагічнай і выхаваўчай работы. У БНТУ дзейнічаюць аднайменныя савет і цэнтр, распрацавана адпаведнае інфармацыйна-метадычнае і арганізацыйнае забеспячэнне ідэалагічна-выхаваучай сферы. Як вынік – пярвічная арганізацыя грамадскага аб'яднання «БРСМ» універсітэта з'яўляецца самай шматлікай у рэспубліцы, налічвае звыш 6500 чалавек. Моладзь БНТУ – ініцыятар аднаўлення руху студэнцкіх будаўнічых атрадаў. Звыш 80 % студэнтаў ахоплена спартыўна-масавай работай.

Б.М. Хрусталёў праводзіць вялікую грамадскую работу, з'яўляецца намеснікам старшыні Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і гуманітарных пытаннях Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, членам Камісіі па навукова-тэхнічнай палітыцы пры Савеце Міністраў, намеснікам страшыні Савета рэктараў ВНУ, галоўным рэдактарам міжнароднага часопіса «Энергетика – Известия высших учебных заведений и энергетических объединений СНГ», уваходзіць у Прэзідыум Асацыяцыі будаўнічых вышэйшых навучальных устаноў краін СНД і Балтыі, член Прэзідыума Нацыянальнага алімпійскага камітэта Рэспублікі Беларусь.

За якую б справу ні браўся Барыс Міхайлавіч, робіць яе з любоўю, адказнасцю, самааддана. Яго ведаюць як шчаслівага сем'яніна, чалавека шчырага, уважлівага да людзей, заўсёды гатовага прыйсці на дапамогу ў цяжкую хвіліну.

Мы далучаемся да шматлікіх віншаванняў, якія ўжо прагучалі ў адрас юбіляра. Здароўя Вам, Барыс Міхайлавіч, здзяйснення самых смелых планаў, далейшай плённай працы на карысць роднай Беларусі!

*Рэдакцыя «ВШ»*